ецца газета «Дзвінская праўда». Помнікі: У. І. Леніну, ахвярам фашызму, воінам-землякам, на брацкіх магілах савецкіх пагранічнікаў і савецкіх воінаў, абеліск памяці Айчыннай вайны 1812 г.

Зона адпачынку — на берагах Заходняй Дзвіны і Дрысы.

Літ.: Россия. Т. 9.— СПб., 1905; Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918—1920 гг. Т. 1.— Мн., 1968; Городские поселения в Российской империи. Т. 1.— СПб., 1860; Живописная Россия. Т. 3.— СПб., 1882; Егоров Ю. Градостроительство Белоруссии.— М., 1954.

У. В. Алісейчык, С. Ф. Цярохін.

543. АБЕЛІСК ПАМЯЦІ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ 1812 г. (гіст.). На вул. Савецкай, у скверы.

Напярэдадні Айчыннай вайны 1812 г. ў лукавіне левага берага Заходняй Дзвіны, насупраць г. Дрыса, была створана ўмацаваная пазіцыя рускай арміі — Дрысенскі лагер. Пабудаваны паводле плана прускага генерала Фуля, ваеннага саветніка Аляксандра I. Займаў тэрыторыю каля 14 км². Меркавалася, што ў выпадку нападу напалеонаўскай арміі на Расію 1-я Заходняя армія пад камандаваннем М. Б. Барклая дэ Толі адыдзе ў Дрысенскі лагер і тут затрымае наступленне галоўных варожых сіл. У гэты час 2-я руская армія пад камандаваннем П. І. Багаціёна нанясе ўдары па флангах і тылу праціўніка.

У Айчынную вайну 1812 г. войскі 1-й рускай арміі адступілі ад Вільні і 29 чэрвеня — 2 ліпеня сканцэнтраваліся ў Дрысенскім лагеры. 30 чэрвеня туды прыбыў з світай Аляксандр I. Пры аглядзе ўмацаванняў генералы далі адмоўнае заключэнне



543. Абеліск памяці Айчыннай вайны 1812 г.



545. Помнік на брацкай магіле савецкіх пагранічнікаў.

аб лагеры. Недахопы яго ў стратэгічных і тактычных адносінах былі відавочныя. Лагер знаходзіўся ў баку ад асноўных стратэгічных напрамкаў, не прыкрываў шляхоў да Масквы і Пецярбурга. Адкрытыя подступы і лясныя масівы давалі магчымасць ворагу канцэнтраваць свае войскі, абысці лагер з флангаў. 2-я армія П. І. Багаціёна не змагла, як планавалася, прабіцца праз Вілейку і вымушана была адыходзіць на Бабруйск. У сувязі з гэтым М. Б. Барклай дэ Толі зрабіў вывад, што праціўнік панясе ўдар па рускай арміі на ўчастку паміж Дняпром і Заходняй Дзвіной, адрэжа 2-ю армію ад 1-й і паставіць яе ў цяжкае становішча. Гэта пацвердзілі дзеянні французскіх войск, асноўныя сілы якіх рухаліся на Докшыцы і Глыбокае, каб паводле стратэгічнага плана Напалеона не дапусціць злучэння рускіх армій, разбіць іх паасобку і ісці на Маскву. Таму Ваенны савет, што адбыўся 1 ліпеня ў Дрысенскім лагеры, падтрымаў М. Б. Барклая дэ Толі, які рашуча патрабаваў злучэння 1-й і 2-й армій і адыходу з Дрысы. 2 ліпеня 1-я армія, за выключэннем корпуса генерала П. Х. Вітгенштэйна, які павінен быў прыкрываць напрамак на Пецярбург, пераправілася цераз Дзвіну і сканцэнтравалася паміж вёскамі Пакаёўцы і Валынцы. 4 ліпеня яна пачала марш на Віцебск. Затрымка 1-й арміі ў Дрысенскім лагеры ўскладніла дзеянні рускіх войск. 1-я і 2-я арміі злучыліся толькі 22 ліпеня ў Смаленску.

У 1912 г. да 100-годдзя Айчыннай вайны 1812 г. пастаўлены абеліск.

Літ.: Харкевич В. И. Война 1812 года. От Немана до Смоленска.— Вильна, 1901; Бескровный Л. Г. Хрестоматия по русской военной истории.— М., 1947.

У. Да. Будзько.

544. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На вул. Савецкай, у гарадскім скверы. Пахаваны савецкія воіны маёр М. С. Маскоўскі і старшы лейтэнант А. Х. Панціелеў, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1954 г. на магіле пастаўлены абеліск. Іх імёнамі названы вуліцы горада.

545. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ПАГРАНІЧНІКАЎ (гіст.). На вул. Савецкай, у гарадскім скверы. Пахаваны 9 воінаў-пагранічнікаў, якія загінулі 17.9.1939 г. пры вызваленні Заходняй Беларусі. У 1959 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна са сцягам.

546. ЖЫЛЫ ДОМ (архіт.). Вул. Савецкая, 43. Пабудаваны ў пачатку 20 ст. з цэглы, неатынкаваны. Двухпавярховы прамавугольны ў плане будынак накрыты вальмавым дахам. Сцены 1-га паверха з рознавялікімі аконнымі праёмамі, дэкарыраванымі арачнымі броўкамі, 2-га — з рытмічна размешчанымі лучковымі праёмамі, упрыгожанымі сандрыкамі. Фасады крапаваны падаконнымі філёнгамі, прафіляваным карнізам на кранштэйнах. Планіроўка 1-га паверха анфіладная, 2-га — спачатку калідорная, пазней некалькі зменена. Жылы дом — помнік грамадзянскай архітэктуры з выкарыстаннем элементаў псеўдаготыкі і стылю «мадэрн».

А. М. Кулагін.

547. МАГІЛА КАЧКАРА Анатоля Цімафеевіча (гіст.). На могілках. Маёр А. Ц. Качкар загінуў у ліпені 1944 г. пры вызваленні горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1959 г. на магіле пастаўлены абеліск. Яго імем названа вуліца горада.

548. МАГІЛА САВЕЦКАГА ВОІНА (гіст.). На вул. Савецкай, у гарадскім скверы. Пахаваны воін, які загінуў у ліпені 1944 г. пры вызваленні горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1963 г. на магіле ўстаноўлена пліта.

549. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА Ў ГОНАР ВЫЗВАЛЕННЯ ГОРАДА І РАЁНА (гіст.). Вул. Гагарына, 58. Устаноўлена ў 1962 г. на будынку райвыканкома.

10.7.1944 г. войскі 2-га Прыбалтыйскага фронту (камандуючы — генерал арміі А. І. Яроменка), ажыццяўляючы Рэжыцка-Дзвінскую аперацыю, перайшлі ў наступленне на поў-



546. Жылы дом.